ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай
работы, культуры і па справах
моладзі Навагрудскага
райвыканкама
М.К. Шабановіч
"_____" _____________ 2017 года

# ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзенні акцыі-пошуку
рарытэтных і рэдкіх выданняў




**Навагрудак, 2017**

## I. Агульныя палажэнні

1.1. Акцыя-пошук рарытэтных і рэдкіх выданняў “Старая кніга” (далей Акцыя-пошук) праводзіцца ДУК "Навагрудская раённая бібліятэка".

1.2. Акцыя-пошук арганізуецца з нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

1.3. Сапраўднае Палажэнне вызначае мэты, задачы і парадак правядзення акцыі-пошуку.

## 2. Мэты і задачы

2.1. Мэты акцыі:

2.1.1. Захаванне кніжнай спадчыны.

2.1.2. Папулярызацыя кнігі і бібліятэкі.

2.2. Задачы акцыі:

2.2.1. Працаваць па прыцягненню новых карыстальнікаў у бібліятэкі.

2.2.2. Садзейнічаць фарміраванню вобраза бібліятэкі, як культурнага, мемарыяльнага і музейнага цэнтра мясцовасці.

2.2.3. Выхоўваць бібліятэчную культуру ў карыстальнікаў.

2.2.4. Распавядаць грамадскасці пра людзей, якія маюць хатнія бібліятэкі, пра іх дабрачыннасць, высокі чытацкі густ.

## 3. Арганізатары і ўдзельнікі

3.1. Арганізатар: аддзел бібліятэчнага маркетынгу ДУК "Навагрудская раённая бібліятэка".

3.2. Выканаўца: структурныя падраздзяленні ДУК "Навагрудская раённая бібліятэка".

## 4. Тэрміны і месца правядзення

4.1. Акцыя-пошук праводзіцца з 1 лютага па 31 ліпеня 2017 года.

4.2. Падвядзенне вынікаў акцыі адбудзецца ў Дзень бібліятэк 15 верасня 2017 года.

## 5. Парадак і ўмовы правядзення

5.1 Пошуку падлягаюць каштоўныя кнігі, унікальныя кнігі, якім 50 і болей гадоў, кнігі на замежных мовах, рэдкія дзіцячыя кнігі і інш.

5.2. Пошук рарытэтных кніг сярод жыхароў горада Навагрудка і Навагрудскага раёна вядуць бібліятэкары ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка”.

5.3. Уласнікі рарытэтных кніг перадаюць іх Навагрудскай раённай бібліятэцы на пастаяннае ці часовае захоўванне. Мінімальны тэрмін захоўвання – да 15 верасня 2017 года.

5.4. Факт перадачы кніг на пастаяннае ці часовае захоўванне ў бібліятэку сведчыць акт прыёма-перадачы, складзены ў 2-х экзэмплярах (для бібліятэкі і ўласніка кнігі) падпісаны ўласнікам кнігі, бібліятэкарам мясцовай бібліятэкі і загадчыкам аддзела абслугоўвання і інфармацыі Навагрудскай раённай. У

выпадку часовага захоўвання кніг у бібліятэцы пры звароце іх уласніку складаецца адпаведны акт прыёма-перадачы.
5.5. Арганізацыйную работу па акцыі ажыццяўляе рабочая група, у склад якой уваходзяць загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Шаўчук Іна Анатольеўна, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Малюжэнец Фаіна Аляксандраўна, галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Івашкевіч Святлана Іванаўна.
5.6. Рабочая група збірае рарытэтныя і каштоўныя кнігі, якія бібліятэкары адшукалі падчас акцыі, і для азнаямлення чытачамі па меры іх паступлення ў Навагрудскай раённай бібліятэцы арганізуе кніжную выставу “Кніжныя скарбы Беларусі”.
5.7. Пастаяннае захаванне сабраных кніг ажыццяўляецца ў Навагрудскай раённай бібліятэцы, яны стануць экспанатамі музея-стэлажа, які дзейнічае ў чытальнай зале аддзела абслугоўвання і інфармацыі.
5.8. Адказнасць за захаванне рарытэтных кніг-экспанатаў нясе загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Навагрудскай раённай бібліятэкі Шаўчук Іна Анатольеўна.

## 6. Падвядзенне вынікаў

6.1. Вынікі акцыі-пошуку падводзяцца рабочай групай.
6.2. Дарыцелі каштоўных кніг узнагароджваюцца Дыпломамі ўдзельніка.
6.3. Найбольш актыўныя бібліятэкары атрымаюць узнагароды ў Дзень культработніка.
6.4. Падчас свята з нагоды 500-годдзя беларускага кнігадрукавання арганізуецца фотасесія дарыцеляў кніг.
6.5. Фотаздымкі і інфармацыя аб гэтых людзях будзе размешчана на сайце ДУК “Навагрудская раённая бібліятэка” http://novcrb.grodno.by